Free Belarus Center

# Вайскова-абаронная палітыка адміністрацыі Лукашэнкі – ад вучэнняў да вайны супраць Украіны

Аўтар: Паўло Радзь

## Змест

| | |
|---|---|
| Уводзіны | 2 |
| 1. Трансфармацыя Беларусі з "Донара рэгіянальнай бяспекі" ў Пагрозу | 3 |
| 2. Роля рэжыму Лукашэнкі ў вайне | 5 |
| 3. Пазіцыі Ўкраіны ў дачыненні да Беларусі пасля 24 лютага 2022 года | 8 |
| Сцэнарыі беларуска-ўкраінскіх адносінаў у галіне бяспекі | 10 |
| Рэкамендацыі | 12 |
| Літаратура | 14 |

# Уводзіны

У апошнія гады геапалітычны пейзаж Еўропы зазнаў зрухі, прычым Беларусь сталася адным з фокусаў складанага геапалітычнага розыгрышу. Дзеянні рэжыму Лукашэнкі падчас пратэстаў 2020 года ды іх наступствы запусцілі працэс дэградацыі адносінаў Мінска ў галіне палітыкі і бяспекі з найбліжэйшымі суседзямі, уключна з Украінай. У спалучэнні з палітычнымі амбіцыямі Масквы гэта прывяло да беспрэцэдэнтнага пагаршэння адносінаў з Украінай, прывёўшы абедзве дзяржавы амаль на парог вайны.

Гэтая аналітычная праца прысвечана падрабязнаму разгляду трансфармацыі беларуска-ўкраінскіх дачыненняў у сферы бяспекі праз прызму эрозіі суверэнітэту Беларусі, выкліканаму падаўленнем пратэстаў у 2020 годзе і далейшым умацаваннем сувязаў з Расіяй. У першай частцы дадзенай працы прадстаўлены рэтраспектыўны аналіз пераўтварэння Беларусі з канструктыўнага рэгіянальнага гульца, які ўмацоўваў нейтралітэт і пашыраў стратэгічную аўтаномію ў рамках саюзу з Расіяй, у баламута, які стаўся плацдармам для поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Ўкраіну.

У другой частцы дадзены аналіз ролі лукашэнкаўскага рэжыму ў руска-ўкраінскай вайне шляхам непасрэднага ўмяшальніцтва беларускіх узброеных сілаў, скіраванага на падтрымку ваенна-інфармацыйных аперацый Расіі, а таксама дзейнасці вайскова-прамысловага комплексу ў шырэйшым кантэксце матэрыяльна-тэхнічнай падтрымкі рускай арміі.

У трэцяй частцы ўвага надаецца аналізу дачыненняў Украіны з Беларуссю ды яе падыходу да стрымлівання рэжыму Лукашэнкі вайскова-палітычнымі сродкамі. Апрача таго, выдзяляецца і аналізуецца Полк Каліноўскага як адзін з элементаў вайскова-палітычнай стратэгіі Ўкраіны ў дачыненні да Беларусі.

З мэтаю прагнозу падзеяў паміж Мінскам і Кіевам ў сферы дачыненняў у галіне бяспекі на двухгадовую перспектыву быў абраны падыход на базе сцэнарыяў. Гэта аналіз чатырох магчымых сцэнарыяў, заснаваны на чатырох пераменных велічынях: a) падзеі руска-ўкраінскай вайны; b) стабільнасць рэжыму Лукашэнкі ды яго здольнасць супраціўляцца ціску; c) выбарчы цыкл на Беларусі; d) стаўленне Кітая да Беларусі.

І, нарэшце, дадзены рэкамендацыі для Ўкраіны і беларускіх дэмакратычных сілаў, каторыя могуць аказацца эфектыўнымі ў наступным двухгадовым перыядзе дзеля развароту ў супрацьлеглым кірунку негатыўных працэсаў.

# 1. Трансфармацыя Беларусі з “Донара рэгіянальнай бяспекі” ў Пагрозу

## 1.1. Беларусь як “донар бяспекі”

Ролю Беларусі падчас першай фазы руска-ўкраінскай вайны звычайна ўспрымаюць як нейтральную платформу для перамоваў, а нават донара рэгіянальнай бяспекі ды стабільнасці. Галоўны ўнёсак у рамках такога працэсу звязаны з гэтак званымі “мінскімі дамоўленасцямі”, дасягнутымі паводле вынікаў руска-ўкраінскай вайны і наступнага геапалітычнага супрацьстаяння паміж Расіяй і Захадам. Паралельна Аляксандр Лукашэнка даў вусныя гарантыі таго, што не будзе дазволена выкарыстоўваць рускімі беларускую тэрыторыю для нападу на Ўкраіну з паўночнага кірунку[1], ды паўторна пацвердзіў міжнародныя абавязацельствы сваёй краіны, у тым ліку выкананне рэжымаў міжнароднага кантролю за ўзбраеннямі і нераспаўсюджвання ядзернай зброі[2].

Нават хаця афіцыйны Мінск і прычыніўся да пошуку формулы мірнага ўрэгулявання канфлікту, зроблена гэта было ў геапалітычных інтарэсах Беларусі ды з выкарыстаннем акна магчымасцяў, якое адчынілася ў 2014 годзе. Па сутнасці, пасля перыду напружання ў адносінах з Захадам, выкліканага рэпрэсіямі 2010 года, беларускае чынавенства ўмела прадала нейтральнасць Беларусі ў абмен на пацяпленне дачыненняў з Еўрапейскім Саюзам.

Такія падзеі пайшлі на карысць ЕС і Ўкраіне, з аднаго боку, і Беларусі, з дугога. Пазіцыі Мінска па пытанні вайны ліквідавалі патэнцыяльныя пагрозы з поўначы, дазволіўшы Ўкраіне сканцэнтраваць большасць рэсурсаў на ўсходнім фронце. ЕС удалося часткова вывесці Беларусь са сферы ўплыву Расіі, знізіўшы магчымыя рызыкі ў галіне бяспекі. Тым не менш, найбольшую выгаду атрымаў рэжым Лукашэнкі. ЕС не толькі дэ-факта прызнаў вынікі прэзідэнцкіх выбараў 2015 года, але і зняў санкцыі[3], накладзеныя пасля падаўлення рэжымам пратэстаў у 2010 годзе. Гэта дазволіла Беларусі пашырыць стратэгічную аўтаномію ў рамках вайскова-палітычнага альянсу з Расійскай Федэрацыяй ды ўмацаваць геапалітычныя пазіцыі, праводзячы шматвектарную замежную палітыку.

Больш таго, менавіта ў той час супалі інтарэсы Беларусі як дзяржавы і рэжыму Лукашэнкі. Лукашэнку ўдалося нейтралізаваць пагрозы, звязаныя з ростам рускіх уплываў, і забяспечыць адсутнасць непасрэдных рызыкаў сваёй уладзе на наступныя гады. У той самы час можна было назіраць умацаванне суверэнітэту Беларусі ды яе ролі на міжнароднай арэне, што давала надзею на будучую трансфармацыю і дэмакратызацыю дзяржавы.

Тым не менш, такая мадэль функцыянавання дзяржавы не вырашала структурнай праблемы, то бок таго факту, што ўсе вышэй памянёныя падзеі былі падагнаныя пад інтарэсы Аляксандра Лукашэнкі. У выніку сістэма, якая ўзнікла пасля 2014 года, была кволай ды залежала ад палітычных патрэбаў беларускага прэзідэнта. Як паказалі падзеі 2020 года, праблема ў поўнай ступені абазначылася, калі Лукашэнка ахвяраваў інтарэсы Беларусі, каб застацца пры ўладзе.

### 1.2. 2020 год і канец нейтральнасці Беларусі

Нягледзячы на тое, што Беларусь не была нейтральнай у звычайным сэнсе гэтага слова ў сувязі з членствам у Арганізацыі дагавору аб калектыўнай бяспецы ды інтэграцыйнымі працэсамі з Расіяй у Саюзнай дзяржаве, Захад цаніў яе высілкі, скіраваныя на балансаванне паміж некалькімі цэнтрамі моцы. Ужо на пачатку 2020 года Беларусь праводзіла вайсковыя вучэнні з брытанскімі ўзброенымі сіламі[4], што падкрэсліла канструктыўную ролю Беларусі ў рэгіёне. Больш таго, Беларусь упершыню наведаў дзяржсакратар ЗША і абвесціў, што беларускі і амерыканскі паслы вернуцца, адпаведна, у Вашынгтон і Мінск [5].

Але ж пазітыўная дынаміка ў стасунках з Захадамператварылася ў пыл на пачатку палітычнага крызісу на Беларусі, які прывёў да беспрэцэдэнтных рэпрэсіяў. У выніку гэтага ЕС адмовіўся прызнаць Аляксандра Лукашэнку легітымным прэзідэнтам[6], і апошні быў вымушаны да ўмацавання сувязяў з Крамлём, каб захаваць сваю палітычную ўладу.

На пачатку Ўкраіна прабавала стрымлівацца ад рэзкай рэакцыі на падзеі на Беларусі і не выказвала адназначнай падтрымкі Еўрапейскаму Саюзу. Тым не менш, пазіцыя Кіева імгненна змянілася праз рашэнне Мінска аб экстрадыцыі байцоў групы Вагнера ў Расію[7], бо такое рашэнне было паказальным у плане выбару Лукашэнкам партнёраў. Украіна не прызнавала вынікаў прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі, але ж стрымлівалася і ад адкрытай падтрымкі Святланы Ціханоўскай і не заклікала да новых выбараў. Украінскія афіцыйныя асобы лічылі гэта кампрамісам і жэстам добрай волі, а не непрыязным актам у дачыненні да Мінска.

Хаця Кіеў і імкнуўся рэалізоўваць палажэнні стратэгіі знешняй палітыкі ў стасунку да Беларусі, выкарыстоўваючы гандаль як сродак супрацьстаяння абмежаванню дзяржаўнага суверэнітэту Расійскай Федэрацыяй[8], у 2021 годзе стала яшчэ відавочней, што рэжым Лукашэнкі ўсё больш уцягваецца ў арбіту Расіі. Прыкметы гэтага можна было прасачыць не толькі на прыкладзе спрыяння вайсковаму супрацоўніцтву з Крамлём[9], але, што важней за ўсё, у плане змяншэння ролі Беларусі ў адносінах з Расіяй у сферы бяспекі.

Вайсковыя вучэнні “Захад-2021” толькі пацвердзілі, што роля Мінска звузілася да перыферыйнага партнёра Расіі, значэнне каторага вызначаецца спецыфікай сітуацыі ў рэгіёне[10].

Гэта яшчэ больш было пацверджана падчас вайсковых вучэнняў “Саюзная рашучасць-2022”, якія праводзіліся на шырэйшым фоне беспрэцэдэнтнай канцэнтрацыі сілаў паблізу мяжы з Украінай. Масква размясціла свае сілы далёка за афіцыйна вызначанымі пунктамі дыслакацыі для вучэнняў, і, як аказалася, гэта была з боку Расіі аперацыя вайсковага зману, накіраваная на фактычную падрыхтоўку да баявых дзеянняў [11].

Нават калі Лукашэнка і ведаў пра планы Крамля, ён не быў у стане аказваць уплыў на галоўнага саюзніка Беларусі ў працэсе прыняцця ім рашэнняў у сувязі з частковай стратай суверэнітэту, асабліва заўважальнай у сферы бяспекі. Гэта прывяло да таго, што па факту Беларусь сталася плацдармам для поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Ўкраіну ды да ўзнікнення пытання аб непасрэдным удзеле Мінска ў баявых дзеяннях.

## 2. Роля рэжыму Лукашэнкі ў вайне

### 2.1. Ускоснае ўмяшальніцтва беларускіх узброеных сілаў у поўнамаштабную агрэсію Расіі супраць Украіны

Хаця фактычна беларускія вайскоўцы і не былі масава задзейнічаныя ў баях, падчас першага года поўнамаштабнай інтэрвенцыі Расіі рэжым Лукашэнкі прадастаўляў рускай арміі істотную дапамогу. Так, у часе наступлення на Кіеў, калі рускія сілы цярпелі значныя страты, беларуская інфраструктура, у тым ліку лякарні і палявыя шпіталі, знаходзіліся ў распараджэнні Масквы. Пры транспартыроўцы забітых і параненых рускія выкарыстоўвалі таксама моргі, чыгуначныя станцыі, авіябазы[12].

Руская армія актыўна ўжывала вайсковыя аб’екты, у першую чаргу, аэрадромы, для вядзення баявых дзеянняў. Ракеты запускаліся з наваколля Мазыра, Калінкавічаў, Хойнікаў ды іншых гарадоў. Рускія лётчыкі выконвалі баявыя вылеты з аэрадромаў у Лідзе, Баранавічах, Мачулішчах і г.д.[13], выкарыстоўваючы паветраную прастору Рэспублікі Беларусь для пуску крылатых ракетаў са стратэгічных бамбардзіроўшчыкаў Ту-22М3[14].

Апрача патралявання нябёсаў знішчальнікі ВПС Беларусі прыкрывалі рускія бамбардзіроўшчыкі Ту-22М3 у беларускай паветранай прасторы падчас іх баявых вылетаў[15]. Беларуская армія актыўна ўжывала сродкі радыёэлектроннай барацьбы каля ўкраінскіх межаў[16], ствараючы сур’ёзныя

праблемы ўкраінскім ВПС, а беларускія сістэмы супрацьпаветранай абароны прыкрывалі аэрадромы, на якіх размяшчаліся рускія самалёты.

Пасля выхаду Расіі з паўночнай часткі Ўкраіны рэжым Лукашэнкі засяроджваўся пераважна на прадастаўленні свайму саюзніку зброі і боепрыпасаў, а такасама на падрыхтоўцы мабілізаваных рускіх салдатаў. У рамках рэгіянальнай групоўкі войскаў на Беларусь прыбыло некалькі эшэлонаў рускіх вайскоўцаў, дзе іх рыхтавалі беларускія інструктары[17].

Акрамя таго,  больш за 200 машын было выведзена з баз захоўвання і перададзена Расійскай Федэрацыі, у тым ліку танкі Т-72А, баявыя машыны пяхоты БМП-2, а таксама грузавыя машыны "Урал[18]. Звыш таго, Беларусь прадаставіла рускім больш за 130 000 тон боепрыпасаў[19].

Паяля таго, як большасць рускага кантынгенту выехала з Беларусі, роля рэжыму Лукашэнкі ў вайне паступова сталася менш заўважальнай. Беларусь разам з Крамлём стварае магчымыя пагрозы з поўначы, каб змусіць Украіну трымаць частку сваіх падраздзяленняў каля мяжы з Беларуссю, што перашкаджае выкарыстоўваць іх на больш прыярытэтных накірунках. Дзеля дасягнення гэтага Мінск рэгулярна праводзіць вайсковыя вучэнні і такія псіхалагічныя аперацыі, як  сумесныя трэніроўкі ВПС ці размяшчэнне тактычнай ядзернай зброі.

## 2.2. Дзейнасць беларускага вайскова-прамысловага комплексу, накіраваная на дапамогу рускай арміі

Нават хаця Беларусь непасрэдна і не задзейнічаная ў баявых дзеяннях, яна выступае ў якасці прамысловай базы для Расійскай Федэрацыі. Руская і беларуская вайсковыя прамысловасці ўзаемазалежныя і шчыльна інтэграваныя. Паводле дадзеных Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэту Рэспублікі Беларусь, 99 беларускіх прадпрыемстваў пастаўляюць 1880 відаў кампанентаў і частак узбраення для 255 прадпрыемстваў рускага вайскова-прамысловага комплексу[20]. Значэнне рускага рынку для беларускай абароннай прамысловасці ўзрастае з 2020 года. Так, у 2019 годзе дзель рускага рынку складала 26% (у параўнанні да 2015 года гэта лічба ўпала напалову, што сталася магчымым, дзякуючы дыверсіфікацыі партнёрстваў), аднак пасля падаўлення пратэстаў ды значнага паслаблення беларускага суверэнітэту сітуацыя змянілася. Таму ў 2022 годзе дзель рускага рынку ў беларускім экспарце дасягнула 60%[21].

Як і ў савецкія часы, беларускі вайскова-прамысловы комплекс пераважна спецыялізуецца ў вытворчасці цяжкіх пазадарожных грузавых аўтамабіляў, рамонце і мадэрнізацыі транспартных сродкаў і самалётаў, выпуску

аптычных прыладаў, прыцэльных комплексаў, сістэм кіравання агнём, радыёэлектроннага абсталявання, комплексаў праграмнага забеспячэння.

Нягледзячы на тое, што Беларусь здольная выпускаць цэлы шэраг лёгкіх бронетранспарцёраў, напрыклад, лёгкую разведвальную бронемашыну БРДМ “Кайман” ці мінна-ўстойлівую машыну з абаронай ад засады (MRAP) “Абаронца”, у рускай арміі яны не былі заўважаны. Тое ж самае датычыць такіх мадэрнізаваных экземпляраў узбраення савецкай эры, як РСЗА “Ураган-М” ці БМ-21Б “БелГрад”. якія маглі б аказацца даволі карыснымі ва ўмовах канфлікту гэтакага маштабу ды інтэнсіўнасці. У выніку Мінск выступае не ў якасці непасрэднага пастаўшчыка, а хутчэй як субпадрадчык з уласнай дзеллю спецыялізацыі ды адказнасці.

Так, мабільныя пускавыя ўстаноўкі для рускіх наземных ракетных комплексаў “Тополь-М” і “Ярс” мантуюцца на колавых шасі, які вырабляе МЗКЦ. На шасі беларускага вытворцы ўсталёўваюцца гэтаксама баявыя кампаненты аператыўна-тактычнага ракетнага комплексу “Іскандэр”, пускавая ўстаноўка РСЗА “Ураган-1М”, самаходныя пускавыя ўстаноўкі і мабільныя радарныя сістэмы ракетнага комплексу СПА  С-400 “Трыюмф” і г.д.[22]

Авіярамонтны завод № 558 ажыццяўляе рамонт і мадэрнізацыю такіх рускіх самалётаў, як Су-25, Су-27, Су-30, МіГ-29, а таксама верталётаў Мі-8 і Мі-24. Беларуская спецыялісты з завода “Манітор-Сервіс, задзейнічаны па просьбе Міністэрста абароны Расіі пры рамонце сістэм СПА “Тунгуска”, Тор”, “Квадрат”[23]. Пашкоджаныя рускія вайсковыя машыны таксама перыядычна рамантуюцца беларускімі механікамі на беларускіх прадпрыемствах альбо і на рускіх, куды іх камандзіруюць з Беларусі[24].

Аднак для Расійскай Федэрацыі найбольшае значэнне ўяўляе высокатэхналагічная вайсковая прадукцыя, у першую чаргу, аптычныя ды оптыка-электронныя сістэмы навядзення агню. АТ “Пеленг” выпускае шматканальны гарматны прыцэл “Сасна-У”[25], які выкарыстоўваецца ў асноўным баявым танку Т-72Б3, гарматны прыцэл з цеплавым каналам “Эса”[26], які ўсталёўваецца на танк Т-90, а таксама гарматны прыцэл “Пліса”, які ўсалёўваецца на танк Т-80У ды яго мадыфікацыі. Апрача таго, “Пеленг” пастаўляе рускім вайскоўцам шматканальныя гарматныя прыцэлы “Вясна-К” і “Сож-ТМ”[27] для баявой машыны БМП-3. АТ “Экран” выпускае бартавое абсталяванне [28] для вайсковых самалётаў МіГ-29, Су-27, Су-30, Су-33, тады як АТ “Інтэграл” з’яўляецца адным з галоўных беларускіх вытворцаў мікрачыпаў [29] для цэлага шэрагу ракет, уключаючы стратэгічныя.

З пачаткам буйнамаштабнай інтэрвенцыі Расіі, натуральна, вырас аб’ём заказаў, якія паступаюць на прадпрыемствы вайскова-прамысловага

комплексу Беларусі. У выніку некаторыя абаронныя прадпрыемствы на Беларусі працуюць на тры змены. Напрыклад, АТ “Пеленг” актыўна набіраў працаўнікоў, атрымаўшы буйную замову на вытворчасць гарматнага прыцэлу “Сасна-У,[30] амаль усе з якіх былі перададзены Расіі. На іншых прадпрыемствах таксама было заўважана значнае павелічэнне абаронных заказаў і вакансіяў, у тым ліку на заводах холдынгу “БелОМА”, АТ МЗКЦ[31], Авіярамонтнага заводу № 558, Аршанскага авіярамонтнага заводу. Таму няма нічога дзіўнага, што Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт Беларусі паведамляў, што аб’ём вытворчасці прамысловай прадукцыі дасягнуў у 2022 годзе гістарычнага максімуму. Хаця пазнейшыя дадзеныя адсутнічаюць, можна меркаваць, што ў 2023 годзе становішча радыкальна не мянялася.

Больш за тое, вайскова-прамысловае супрацоўніцтва паміж Беларуссю ды Расіяй будзе працягвацца. Паводле Праграмы вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй да 2025 года, запланаваны шэраг мерапрыемстваў. Сярод іх – сумесныя навукова-даследчыя працы над некаторымі новымі мадэлямі ўзбраення і вайсковага абсталявання, мадэрнізацыя існуючых, запуск сумеснай вытворчасці канцовых тыпаў узбраення, вайсковага абсталявання ды іх кампанентаў, а таксама ажыццяўленне захадаў сумеснай палітыкі ў галіне ўсталявання ставак, стандартызацыі, каталагізацыі вайсковай прадукцыі[32].

Цяперашняя формула супрацоўніцтва ў галіне абароны паміж Мінскам і Масквой дэманструе, што імавернасць непасрэднага ўмяшальніцтва беларускіх вайскоўцаў у вайну з’яўляецца невысокай. Беларусь – гэта не істотны баявы актыў, а хутчэй ціхая гавань, дзе можна выраблясць вайсковае абсталяванне і запчасткі без рызыкі стацца аб’ектам нападу з боку Украінскіх узброеных сілаў. Хаця ўмацаванне сувязяў у сферы бяспекі і з’яўляецца адным з інструментаў Масквы дзеля паглынання Беларусі, рэжым Лукашэнкі патэнцыяльна мае інтарэсы, якія выходзяць па-за рамкі лепшай падрыхтоўкі ўзброеных сілаў альбо развіцця беларускага вайскова-прамысловага комплексу. У такім характары паводзінаў існуюць таксама свае палітыка-эканамічныя элементы. Так, паспяховае скарыстанне беларускіх распрацовак у баявых умовах можа спрыяць паскарэнню вайсковага супрацоўніцтва з Кітаем ды Іранам, што важна ў кантэксце ўраўнаважвання ўплываў Расіі на Беларусі. Апрача таго, гэта можа пракласці шляхі да павелічэння вайсковага экспарту ў краіны Азіі і Афрыкі, што прынясе дадатковыя даходы ў Беларускі бюджэт.

# 3. Пазіцыі Ўкраіны ў дачыненні да Беларусі пасля 24 лютага 2022 года

### 3.1. Стрымліванне рэжыму Лукашэнкі вайскова-палітычнымі сродкамі

Пасля таго, як рэжым Лукашэнкі стаўся суагрэсарам на самым пачатку поўнамаштабнай інтэрвенцыі Расіі, адносіны паміж Украінай і Беларуссю пагоршыліся да найніжэйшай кропкі ў гісторыі. Палітычны дыялог паміж Мінскам і Кіевам адсутнічае, а Зяленскі з Лукашэнкам перыядычна абменьваюцца пад адрасам адзін аднаго непахвальнымі заявамі. Дыпламатычныя адносіны прыпынены, асабліва пасля звальнення беларускага і ўкраінскага паслоў[33]. Рэшткі былога супрацоўніцтва расплываюцца пад сілай увядзеных санкцыяў ды дэнансацыі ўзаемных дагавораў у гуманітарный ды палітыка-эканамічнай сферах[34].

З другой паловы 2022 года дачыненні паміж дзвюма дзяржавамі можна ахарактарызаваць як сталае ўзаемнае стрымліванне. У гэтакіх умовах камунікацыя падтрымліваецца праз службы выведкі альбо іншыя непублічныя каналы, каб аказваць уплыў на беларускае вайскова-палітычнае кіраўніцтва ды пазбягаць узнікнення дадатковых пагроз[35]. Падрабязнасці такіх перамоваў невядомыя, але, як падаецца, Мінск і Кіеў абмяняліся пэўнымі вуснымі запэўненнямі, у рамках каторых абодва бакі акрэслілі ўзаемна прымальныя дзеянні.

Гэта можа быць прычынай таго, чаму ўкраінскія сілы спецыяльнага прызначэнне не праводзяць дыверсіных аперацый у глыбіні беларускай тэрыторыі ды не наносяць udaраў па вайсковых аб'ектах, як гэта мае месца ў Расіі, тады як тон заяў беларускіх афіцыйных асобаў і іх дзеянні становяцца ўсё менш і менш агрэсіўнымі. Больш за тое, існуе пэўная логіка ў працягванні дыпламатычных стасункаў з Рэспублікай Беларусі, якая выходзіць па-за рамкі чыста гуманітарных прычын. Прысутнасць некалькіх украінскіх дыпламатаў на тэрыторыі Беларусі – гэта гарантыя таго, што афіцыйны Кіеў не ўжыве супраць Беларусі вайсковай сілы.

Тым не менш, стабілізацыя становішча не азначае, што Ўкраіна не рыхтуе сцэнарыяў на найбольш неспрыяльны выпадак. Так, Украіна працягвае будаваць абарончыя лініі на мяжы з Беларуссю. За некалькі апошніх месяцаў колькасць умацаванняў у Паўночнай аперацыйнай зоне ўзрасла на 63%[36]. Апрача таго, украінскае камандаванне праводзіць рэгулярныя вайсковыя вучэнні на кірунках патэнцыяльных спробаў прарыву ці правакацыяў[37].

### 3.2. Полк Каліноўскага як элемент вайскова-палітычнай стратэгіі Ўкраіны ў дачыненнях з Беларуссю

На самым пачатку поўнамаштабнай інтэрвенцыі Кіеў падтрамаў стварэнне беларускіх добраахвотніцкіх частак, у прыватнасці, Палка Каліноўскага, каторы пазней набыў палітычныя амбіцыі ды стаўся другім найбуйнешым гульцом у дэмакратычным руху.

У якасці галоўнай мэты Полк Каліноўскага дэкларуе вызваленне Беларусі праз вызваленне Ўкраіны. Тым не менш, яго здольнасці ў плане дасягнення такой мэты даволі абмежаваныя па прычыне некалькіх фактараў. Перш за ўсё, гэты Полк – хутчэй невялікая баявая частка, якая складаецца з некалькіх соцень добраахвотнікаў і не мае ў сваім распараджэнні цяжкага ўзбраення. Што важней за ўсё, адсутнічае дакладнае разуменне таго, як беларускія добраахвотнікі могуць дзейнічаць па-за рамкамі руска-ўкраінскай вайны. Нават нягледзячы на тое, што добраахвотнікі валодаюць пэўнай мерай аўтаноміі, яны ўсё-ткі з'яўляюцца часткай вайсковай іерархіі ў структуры Ўкраінскіх узброеных сілаў, а іх дзеянні на полі бою цалкам вызначаюцца ўкраінскім камандаваннем[38].

У выніку Кіеў пераважна ўспрымае Полк Каліноўскага ў якасці палітычнага актыву, які ўпісваецца ў вайскова-палітычную схему стрымлівання рэжыму Лукашэнкі. Няма сумневаў, што апошні разглядае Полк як крыніцу патэнцыяльных пагроз і дэстабілізацыі ў краіне. Таму Міністэрства ўнутраных спраў стварыла некалькі антытэрарыстычных частак[39] на фоне дыверсійнай разведвальнай дзейнасці, якую праводзіць Рускі добраахвотніцкі корпус у Белгарадскай і Бранскай абласцях. Больш за тое, беларускі КДБ акрэсліў добраахвотнікаў экстрэмістамі [40] і адкрыў крымінальныя справы супраць членаў іх сем'яў[41].

## Сцэнарыі беларуска-ўкраінскіх адносінаў у галіне бяспекі

Сцэнарыі будучых беларуска-ўкраінскіх адносінаў у галіне бяспекі залежаць не толькі ад унутраных фактараў і трэндаў у дачыненнях паміж дзвюма дзяржавамі, але таксама ад знешніх, каторыя могуць істотна змяніць ходу падзеяў. У выніку можна вылучыць наступныя пераменныя велічыні, якія маюць патэнцыял уплыву на такія сцэнарыі:

- Падзеі руска-ўкраінскай вайны;
- Стабільнасць рэжыму Лукашэнкі ды яго здольнасць супрацьстаяць ціску;
- Выбырчы цыкл на Беларусі, які ўяўляе сабою як рызыку, так і акно магчымасцяў;
- Пазіцыя Кітая ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь.

**Сцэнарый 1. Аб’яднаны фронт**

Па меры працягу вайны павялічваюцца патрэбы Расіі ва ўзбраеннях і жывой сіле. Гэта змушае Крэмль паскорыць інтэграцыйныя працэсы з Беларуссю, асабліва ў галіне бяспекі. Беларускі вайскова-прамысловы комплекс падпарадкуецца патрэбам Расіі, рамантуючы пашкоджаную зброю і выпускаючы новую прадукцыю для Ўзброеных сілаў Расіі. Масква і Мінск павялічваюць спектр інфармацыйных аперацыяў супраць Украіны і краін НАТА.

Больш таго, на рэжым Лукашэнкі аказваецца ціск з мэтаю прадастаўлення Маскве ўзбраенняў, што знаходзяцца ў непасрэдным распараджэнні беларускіх брыгад, ды адпраўкі патаемна некаторых сваіх войскаў на лінію фронту, беручы пад увагу, што беларускія прафесійныя салдаты лепш падрыхтаваныя і навучаныя, чым нядаўна прызваныя рускія. Гэты факт прыводзіць да парушэння вусных завярэнняў, дадзеных Лукашэнкам, і адкрывае шлях да нападу Ўкраіны на НПЗ, чыгункі і вайсковую інфраструктуру на беларускай тэрыторыі.

**Сцэнарый 2. Беларускі “шчыт”**

Нягледзячы на тое, што беларуская прамысловасць вырабляе запчасткі пад рускія патрэбы, Лукашэнку ўдаецца захоўваць пэўную ступень аўтаноміі ў альянсе з Расіяй з адсылкай на пагрозы, якія ідуць з Захаду. Ён прадае Пуціну ідэю, што Беларусь – гэта памежжа Саюзнай дзяржавы і знаходзіцца ў супрацьстаянні з НАТА, што патрабуе ад яго трымаць вайсковыя ды іншыя рэсурсы ўнутры краіны на выпадак правядзення Захадам палітыкі эскалацыі.

Пры адсутнасці значных пераменаў на полі бою Лукашэнка выкарыстоўвае статус-кво як магчымасць далейшага ўмацавання сваіх пазіцыяў, асабліва напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. У адносінах з Украінай не адбываецца значных змен, а Кіеў працягвае ўспрымаць Беларусь як “шэрую зону” і крыніцу патэнцыяльных пагрозаў. Магчымы асобныя дробныя правакацыі, аднак яны не ўцягнуць Беларусі ў вайну.

**Сцэнарый 3. Гульня балансавання**

Лукашэнка застаецца адзіным афіцыйным саюзнікам Расіі ў Еўропе. Тым не менш, пасля выбарчага цыклу ён прабуе выйсці з супрацьстаяння ў дачыненнях з заходнімі дзяржавамі і развіваць больш блікія адносіны з Кітаем, у тым ліку ў галіне бяспекі. Пекін зацікаўлены беларускімі вайсковымі распрацоўкамі ды ўмацоўвае супрацоўніцтва на некалькіх кірунках. Гэта дапамагае зменшыць дзель рускага рынку і дыверсіцыраваць вайсковы

экспарт. Рэжым адмаўляецца выкарыстоўваць супраць Украіны агрэсіўную рыторыку пасылае сігналы аб гатоўнасці весці больш сур’ёзны дыялог з афіцыйным Кіевам. Пачынаецца перыяд палітычных гульняў без ясных перспектываў.

**Сцэнарый 4. Пераход**

Замарозка вайны альбо аслабленне Расійскай Федэрацыі адчыняе акно магчымасцяў для прасуверэнітэтнай часткі беларускіх элітаў, што падштурхоўвае да далейшай дээскалацыі ў адносінах з суседзямі. Лукашэнка вырашае патрымаць такія тэндэнцыі, баючыся магчымага рэваншу Масквы ў якасці кампенсацыі за паразы ва Ўкраіне. Умацаванне прасуверэнітэтнай часткі беларускага істэблішменту прыводзіць да дэлегітымізацыі Лукашэнкі і яго адхілення ад улады. У выніку гэтага беларускія дэмакратычныя сілы вядуць перамовы аб механізме суіснавання з вышэйпамянёнай групай элітаў.

У рамках такога працэсу Кіеў і Мінск максімальна зніжаюць ступень напружання. Паміж двума бакамі пачынаецца сур’ёзны дыялог, што прыводзіць да частковай адбудовы даверу паміж дзвюма дзяржавамі, адчыняюцца шырэйшыя магчымасці для супрацоўніцтва ў галіне бяспекі на сярэднюю і больш аддаленую перспектыву.

Тым не менш, варта адзначыць, асобныя элементы кожнага са сцэнарыяў з’яўляюцца ўзаемазамяняльнымі, што можа стварыць злёгку розны комплекс магчымых падзеяў у будучым. Апрача таго, магчымы і некаторыя нечаканыя падзеі, як, напрыклад, смерць Пуціна ці Лукашэнкі, што можа прывесці да яшчэ глыбейшых пераменаў негатыўнага альбо пазітыўнага характару.

## Рэкамендацыі

Беручы пад увагу тую сітуацыю, якая развіваецца вакол беларускага пытання, можна падкрэсліць дзве галоўныя мэты, агульныя для Ўкраіны і дэмакратычнага руху.

1. Устараненне магчымасці непасрэднай узброенай канфрантацыі паміж Украінай і Беларуссю, а таксама супрацьдзеянне вайсковаму супрацоўніцтву паміж Мінскам і Масквой. Гэта можа быць дасягнута з дапамогай наступных мерапрыемстваў:

- Украіна ў супрацоўніцтве з Польшчай, краінамі Балтыі і дэмакратычнымі сіламі павінна крыху змяніць падыход да садзейнічання рэалізацыі санкцыяў на еўрапейскім узроўні, звярнуўшы ўвагу пераважна на прадпрыемствы беларускага вайскова-прамысловага комплексу, якія

супрацоўнічаюць з падобнымі рускімі прадпрыемствамі.

- Украіна павінна разрываць лагістычныя шляхі зносінаў паміж Расіяй і Беларуссю, а таксама ў супрацоўніцтве з еўрапейскімі дзяржавамі пазбаўляць рэжым Лукашэнкі магчымасцяў абыходу санкцыяў ды здабычы кампанентаў заходняга паходжання для сваёй вайсковай прадукцыі.
- Украіна павінна праінфармаваць беларускае кіраўніцтва праз непублічныя каналы аб тым, што прадастаўленне рускім вайскоўцам новых узбраенняў беларускай вытворчасці непазбежна прывядзе да прыняцця мераў супрацьдзеяння.
- Дэмакратычным сілам і адпаведным украінскім службам мае сэнс усталёўваць кантакты з супрацоўнікамі беларускіх вайскова-прамысловых прадпрыемстваў, каторыя займаюць антываенныя пазіцыі, каб атрымліваць інфармацыю аб сітуацыі ў гэтай галіне. Так, можна ўжываць з карысцю фармальныя і нефармальныя кантакты паміж украінскімі і беларускімі збройнікамі, беручы пад увагу маштаб супрацоўніцтва ў мінулым.
- Беларускія кіберпартызаны ў каардынацыі з украінскімі спецыялістамі са сферы IT павінны збіраць дакументацыю і адпаведную інфармацыю адносна дзейнасці беларускага вайскова-прамысловага комплексу, у тым ліку ў інтарэсах Расійскай Федэрацыі.

2. Як прадэманстраваў дапратэсны перыяд, найлепшы інструмент, каб пазбегнуць умацавання Расіі на Беларусі, – гэта паглыбленне беларускага суверэнітэту. Таму наступным крокам павінна стацца забеспячэнне таго, каб Беларусь адмяжоўвалася ад Расійскай Федэрацыі, пашыраючы поле для манеўру. Такія падзеі патэнцыяльна могуць стаць неабходнай перадумовай для магчымасці дэмакратычных пераўтварэнняў на Беларусі.

- Украіна павінна распрацаваць універсальную стратэгію ў дачыненні да Беларусі, якая б выйшла па-за рамкі падыходаў дзеля стрымлівання, уключаючы ў сябе шырокі камплект інструментаў, скіраваных на развіццё інфраструктуры ўплыву на Беларусі.
- Мае сэнс распрацаваць і прадставіць Лукашэнцы ў каардынацыі з дзяржавамі-членамі “Люблінскага трохвугольніка” канфідэнцыяльную “дарожную мапу” на тэму магчымых саступак, на якія мог бы пайсці рэжым, і як Украіна з партнёрамі магла б адрэагаваць на такія дзеянні.
- Дэмакратычныя сілы павінны падтрымліваць кантакты на розных узроўнях з часткаю беларускіх афіцыйных асобаў у Мінску, гарантуючы, што тыя не будуць паддадзены люстрацыі ў выпадку дэмакратычных пераўтварэнняў, ды спасылаючыся на суверэнітэт Беларусі як супольную каштоўнасць.
- Украіна разам з дэмакратычнымі сіламі павінна весці пошук шляхоў да аказвання ўплыву на частку беларускіх элітаў, якія не з’яўляюцца па сваёй прыродзе прадэмакратычнымі. Карысць для пераканання гэтай часткі

чынавенства могуць прынесці такія аргументы, якія звязаны з магчымымі праблемамі праз паглыбленне эканамічнага і дэмаграфічнага крызісу, і што толькі эфектыўная і моцная беларуская дзяржава – гэта гарантыя іх палітычнай будучыні.

# Літаратура

[1] Gordon: Турчинов: когда начались захваты наших частей, я пытался на вертолете вылететь в Крым, чтобы организовать оборону аэродрома. Меня удержал Аваков [When the capture of our military bases began, I tried to fly by helicopter to Crimea to organise the defense of the airfield. Avakov held me back]. April 11, 2018. https://gordonua.com/publications/turchinov-kogda-nachalis-zahvaty-nashih-chastej-ja-pytalsja-na-vertolete-vyletet-v-krym-chtoby-organizovat-oboronu-aerodroma-menja-uderzhal-avakov-239748.html

[2] President of the Republic of Belarus Website: Minsk Dialogue Forum "European Security: Stepping Back from the Brink". October 8, 2019. https://president.gov.by/en/events/minsk-dialogue-forum-european-security-stepping-back-from-the-brink-22182

[3] BBC: ЕС снял санкции с Лукашенко и еще со 169 белорусских чиновников [The EU lifted sanctions imposed against Lukashenka and 169 other Belarusian officials]. February 15, 2016. https://www.bbc.com/russian/news/2016/02/160215_eu_lukashenko_sanctions

[4] Ministry of Defence of the United Kingdom: Royal Marines travel to Belarus for winter warfare exercise. February 29, 2020. https://www.gov.uk/government/news/royal-marines-travel-to-belarus-for-winter-warfare-exercise

[5] BBC: в Вашингтон едет белорусский посол. Впервые за 12 лет [Belarusian ambassador is heading for Washington. For the first time in 12 years]. July 20, 2020. https://www.bbc.com/russian/news-53474557

[6] Radio Liberty: EU Does Not Recognise Lukashenka As Belarusian President, Borrell Says. September 15, 2020. https://www.rferl.org/a/eu-does-not-recognize-lukashenka-borrell-says/30840563.html

[7] ZN, UA: Беларусь выдала России 32 боевика ЧВК "Вагнер" [Belarus extradited 32 PMC Wagner fighters to Russia]. August 14, 2020. https://zn.ua/WORLD/belarus-vydala-rossii-32-boevikov-chvk-vahner.html

[8] P. Rad, Foreign Policy Council Ukrainian Prism: The Security Risks from the Republic of Belarus: Ways of Minimisation. http://prismua.org/wp-content/uploads/2023/12/The-security-risks-from-Belarus.pdf

[9] Belarus Security Blog: Положение в сфере национальной безопасности Беларуси. Август 2021 года [The situation in the realm of national security of Belarus. August 2021]. https://bsblog.info/polozhenie-v-oblasti-nacionalnoj-bezopasnosti-belarusi-avgust-2021-goda/

[10] Belarus Security Blog: Запад-2021 становиться российским [Zapad 2021 is becoming Russian]. https://bsblog.info/zapad-2021-stanovitsya-rossijskim/

[11] R. McDermott, The Jamestown Foundation: Allied Resolve 2022: Moscow's Maskirovka Operation. February 2, 2022. https://jamestown.org/program/allied-resolve-2022-moscows-maskirovka-operation/

[12] CNN: Inside the hospitals that concealed Russian casualties. October 25, 2022. https://edition.cnn.com/interactive/2022/10/europe/belarus-hospitals-russian-soldiers-ukraine/index.html

[13] Radio Liberty: Откуда авиация России обстреливает территорию Украины ракетами [From where is Russian aviation firing missiles at Ukrainian territory?]. March 22, 2022. https://ru.krymr.com/a/rossiya-ukraina-aerodromy-raketniye-udary/31765201.html

[14] The New York Times: Russia launches barrage of missiles across Ukraine. June 26, 2022. https://www.nytimes.com/interactive/2022/world/europe/ukraine-maps.html

[15] Sputnik: Второй фронт спецоперации? Ударные возможности группировки войск РФ и РБ [The second front of the special military operation? Offensive capabilities of the grouping of troops of the Russian Federation and the Republic of Belarus]. October 18, 2022. https://lv.sputniknews.ru/20221018/vtoroy-front-spetsoperatsii-udarnye-vozmozhnosti-gruppirovki-voysk-rf-i-rb-23076322.html

[16] ZN, UA: Беларусь на границе с Украиной активно использует системы РЭБ [Belarus actively uses electronic warfare systems on the border with Ukraine]. June 16, 2022. https://zn.ua/UKRAINE/belarus-na-hranitse-s-ukrainoj-aktivno-ispolzuet-sistemy-reb-hnsu.html

[17] Belarusian Hajun project: Российский телеканал "Звезда" показал в своем сюжете инструктора из ВС РБ, который тренирует "мобиков"? [Russian TV channel Zvezda featured in its story an instructor from the Belarusian Armed Forces who trains Russian mobilised soldiers?]. December 13, 2022. https://t.me/Hajun_BY/5947

[18] UNIAN: Танки, Уралы и БМП: за октябрь Беларусь передала РФ более 200 единиц военной техники [Tanks, Urals and BMPs: during October Belarus transferred to Russia more than 200 military vehicles]. November 17, 2022. https://www.unian.net/war/za-oktyabr-belarusi-peredala-rf-bolee-200-edinic-voennoy-tehniki-chto-imenno-otdali-12048915.html

[19] Belarusian Hajun project: 131 582 тонны боеприпасов передал режим Лукашенко РФ за 1 год [During the last year the Lukashenka regime transferred to Russia 131,582 tonnes of munition]. June 10, 2023. https://t.me/Hajun_BY/6941

[20] SB.BY: Кооперация Беларуси и России в военно-технической сфере набирает обороты [Cooperation between Belarus and Russia in the military-technical sphere is gaining momentum]. March 31, 2023. https://www.sb.by/articles/dvoynoy-shchit-soyuza.html

[21] National Defense: Развитие военно-технического сотрудничества с Российской Федерацией отвечает национальным интересам Республики Беларусь [Development of military-technical

cooperation with the Russian Federation meets national interests of the Republic of Belarus]. December 27, 2023. https://oborona.ru/product/zhurnal-nacionalnaya-oborona/razvitie-voenno-tekhnicheskogo-sotrudnichestva-s-rossijskoj-federaciej-otvechaet-nacionalnym-interesam-respubliki-belarus-45323.shtml

[22] Z. Kokoshkina: Вопросы военно-технического сотрудничества между Российской Федерацией и Республикой Беларусь [Issues of military-technical cooperation between the Russian Federation and the Republic of Belarus]. https://interaffairs.ru/jauthor/material/2225

[23] Z. Kokoshkina: Вопросы военно-технического сотрудничества между Российской Федерацией и Республикой Беларусь [Issues of military-technical cooperation between the Russian Federation and the Republic of Belarus]. https://interaffairs.ru/jauthor/material/2225

[24] Charter 97: Белорусских рабочих зовут ремонтировать российскую технику [Belarusian workers are invited to repair Russian military equipment]. December 27, 2023. https://charter97.org/ru/news/2023/12/27/577191/

[25] Odetie v broniu: Многоканальный прицел наводчика “Сосна-У” [multi-channel gunner sight Sosna-U]. https://odetievbrony.ru/viewtopic.php?id=463

[26] Odetie v broniu:Тепловизионный прицел “Эсса” [gunner sight with thermal channel Essa]. https://odetievbrony.ru/viewtopic.php?id=475

[27] BelTechExport: Системы управления огнем танков и БМП [Fire control systems for tanks and infantry fighting vehicles]. https://bte.by/katalog/tekhnika-sukhoputnykh-voysk/sistemy-upravleniya-ognem-tankov-i-bmp-1.html

[28] SB.BY: Военный эксперт о кооперации Беларуси и России в сфере военных технологий [Military expert on cooperation between Belarus and Russia in the realm of military technologies]. April 18, 2023. https://www.sb.by/articles/voennyy-ekspert-o-kooperatsii-belarusi-i-rossii-v-sfere-voennykh-tekhnologiy.html

[29] Z. Kokoshkina: Вопросы военно-технического сотрудничества между Российской Федерацией и Республикой Беларусь [Issues of military-technical cooperation between the Russian Federation and the Republic of Belarus]. https://interaffairs.ru/jauthor/material/2225

[30] Zerkalo: Сотрудники военно-промышленных предприятий - о работе, зарплате, занятости и совести [Employees of military-industrial enterprises about work, salary, business, and conscience]. October 20, 2022. https://news.zerkalo.io/economics/24317.html

[31] Euroradio: Вдвое больше вакансий. Как изменились оборонные предприятия Беларуси [Twice as many vacancies. How the defence enterprises in Belarus have changed]. July 27,  2023. https://euroradio.fm/ru/vdvoe-bolshe-vakansiy-kak-izmenilis-oboronnye-predpriyatiya-belarusi

[32] Sputnik: Какую военную технику будет делать ВПК Беларуси совместно с РФ [What kind of military equipment will the military-industrial complex of Belarus produce together with Russia?]. April 3, 2023. https://sputnik.by/20230403/kakuyu-voennuyu-tekhniku-budet-delat-vpk-belarusi-sovmestno-s-rf-1073968422.html

[33] 24 Channel: Спустя более 20 месяцев войны: Лукашенко уволил посла Беларуси в Украине [After more than 20 months of war: Lukashenka fired the Belarusian ambassador to Ukraine]. October 19, 2023. https://24tv.ua/ru/lukashenko-snjal-dolzhnosti-posla-belarusi-ukraine-kakaja-prichina_n2415341

[34] LB: Україна денонсувала низку угод із Білоруссю та РФ [Ukraine denounced several agreements with Belarus and Russia]. August 23, 2023. https://lb.ua/economics/2023/08/23/571463_ukraina_denonsuvala_nizku_ugod_iz.html

[35] Ukrainian Pravda: Буданов зізнався, що нардепа Шевченка задіяли для комунікації з Лукашенком [Budanov admitted that MP Shevchenko was involved in communication with Lukashenka]. May 16, 2023. https://www.pravda.com.ua/news/2023/05/16/7402495/

[36] Espreso: Ukraine fortifies its northern border with Russia and Belarus. January 11, 2024. https://global.espreso.tv/military-news-designed-to-deter-at-least-battalion-nayev-on-new-defense-strip-on-border-with-belarus-russia

[37] 5 Channel: Українські військові провели навчання на кордоні з Білоруссю [Ukrainian military conducted drills at the border with Belarus]. December 23, 2023. https://www.5.ua/ukrayina/ukrainski-viiskovi-provely-navchannia-na-kordoni-z-bilorussiu-video-319486.html

[38] Belsat: Командир полка Калиновского встретился с беларусами Варшавы [Commander of the Kalinouski Regiment met with the Belarusians in Warsaw]. January 22, 2024. https://belsat.eu/ru/news/22-01-2024-berem-kurs-na-dolguyu-vojnu-komandir-polka-kalinovskogo-vstretilsya-s-belarusami-varshavy

[39] SB.BY: Карпенков сообщил о формировании во внутренних войсках “Беркута” и еще нескольких новых спецподразделений [Karpenkov announced the formation of Berkut and several other new special forces’ units]. March 17, 2023. https://www.sb.by/articles/karpenkov-soobshchil-o-formirovanii-vo-vnutrennikh-voyskakh-berkuta-i-eshche-neskolkikh-novykh-spets.html

[40] Mediazona: МВД признало полк Калиновского экстремистским формированием [Ministry of Internal Affairs recognised the Kalinousky Regiment an extremist organisation]. September 23, 2022. https://mediazona.by/news/2022/09/23/polk

[41] Viasna: Преследование родственников “калиновцев”, давление на заключенных [Persecution of relatives of the Kalinusly regiment fighters, pressure on prisoners]. November 21, 2023. https://spring96.org/ru/news/113373

Праект рэалізуецца Free Belurus Center.
Каардынатарка праекта Роза Турарбекава.